*Гоўзіч І.М.*
***БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА. XI КЛАС***



## ТЭМА 6. НІЛ ГІЛЕВІЧ.

1. **Запішыце у сшытках асацыяцыйны** рад слоў ад слова «чалавечнасць». Побач напішыце словы, якія не стасуюцца з паняццем «чалавечнасць». Абмяркуйце свой выбар у пары, потым у групе, выберыце (1 – 2) самыя яркія словы. Складзіце сінквейн да паняцця чалавечнасць:

Назва
Два прыметнікі
Тры дзеяслова
Сказ (асноўная думка) з чатырох слоў
Сінонім назвы (назоўнік)

2. **Напішыце эсэ-мініяцюру** «Якім я бачу чалавека XXI стагоддзя» або «Як стаць чалавекам...», «Каб не было сорамна перад нашчадкамі...».

3. Паразважайце над пытаннем: Чаму некаторыя людзі гавораць, што патрыятызм з’яўляецца не вельмі важным? Падбярыце антонімы да слова-паняцця патрыятызм.

4. Ці з’яўляецца патрыётам лірычны герой рамана Н. Гілевіча «Родныя дзеці»? Адкажыце разгорнута на пытанне, выкарыстоўваючы цытаты з тэксту, якія сведчаць пра
а) адносіны да Радзімы;
б) адносіны да прыроды;
в) адносіны да культуры і традыцый;
г) адносіны да продкаў;
д) адносіны да маці;
е) адносіны да сусветных праблем (і г.д.).

5. Падрыхтуйце **даклад** на тэму ««Родныя дзеці» Ніла Гілевіча як узор сучаснага паэтычнага эпасу».

6. Якія творы Н. Гілевіча найбольш вам падабаюцца і чаму? Абгрунтуйце свой выбар. Пастарайцеся **завучыць на памяць** некалькі радкоў з іх, каб ваш адказ быў аргументаваны.

7. **Параўнайце індывідуальныя стылі** Ніла Гілевіча і Аркадзя Куляшова. Свае назіранні прадстаўце ў выглядзе канцэптуальнай табліцы:

| **Пытанні** | **Ніл Гілевіч** | **Аркадзь Куляшоў** |
|---|---|---|

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | |
|---|---|---|
| Гады жыцця | | |
| Пачатак літаратурнай дзейнасці | | |
| Асноўныя этапы творчасці | | |
| Асноўныя тэмы | | |
| Асноўныя жанры | | |
| Лірычны герой | | |
| Традыцыі і наватарства | | |
| Ацэнка крытыкаў | | |
| Іншае | | |

8. **Дапамажыце кветцы аднавіць пялёсткі, у якіх пазначаюцца назвы твораў Ніла Гілевіча:**




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ